## *К. КАЛІНОЎСКІ І ПАЎСТАННЕ 1863 ГОДА*



1 Біяграфічная табліца.
2 Гісторыя стварэння, матывы і паэтыка верша “Марыська чарнаброва, галубка мая...”
3 Майстэрства К. Каліноўскага-публіцыста.
4 Дзесяць цікавых фактаў пра Кастуся Каліноўскага.
5 Асноўныя тэрміны.

– Каго любіш?
– Люблю Беларусь!
– То ўзаемна!
(пароль паўстанцаў 1863 года)

### 1 Біяграфічная табліца

### КАСТУСЬ КАЛІНОЎСКІ (1838–1864)

| год | падзея |
|---|---|
| 21 студзеня (12 лютага) 1838 г. | Нарадзіўся ў в. Мастаўляны Гродзенскага павета ў шляхецкай сям’і ўладальніка невялікай фабрыкі ільняных вырабаў. |
| 1843 г. | Памірае маці – Вераніка Рыбінская. |
| 1849 г. | Сям’я пераязджае ў набыты фальварак Якушоўка Ваўкавыскага павета. |
| 1847–1855 гг. | Вучоба ў Свіслацкай прагімназіі, вядомай сваімі асветніцкімі і патрыятычнымі традыцыямі. |
| к. 1855 – пач.1856 г. | Едзе ў Маскву да брата Віктара, дзе некаторы час слухае лекцыі ў Маскоўскім медыцынскім інстытуце. |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

| | |
|---|---|
| 1856 г. | Браты пераязджаюць у Пецярбург. |
| 1856–1860 гг. | Вучоба ў Пецярбургскім універсітэце на юрыдычным факультэце; знаёмства з ідэямі рускіх і польскіх рэвалюцыйных дэмакратаў, часопісамі “Современник” і “Колокол”. |
| 1858 г. | У Пецярбургу афармілася нелегальная ваенна-рэвалюцыйная арганізацыя выхадцаў з Польшчы, Літвы і Беларусі пад кіраўніцтвам З. Серакоўскага і Я. Дамброўскага. Браты становяцца яе актыўнымі ўдзельнікамі. |
| 1861 г. | Атрыманне дыплома кандыдата правоў; Юзаф Ямант, універсітэцкі сябра, знаёміць Каліноўскага ў Вільні са сваёй сятрой Марыляй; вяртанне на Радзіму, стварэнне ў Гродзенскай губерніі разгалінаванай падпольнай арганізацыі. |
| 1862 г.<br><br><br><br>улетку<br>увосень | Узначальвае ў Вільні ЛПК (Літоўскі правінцыяльны камітэт). Прадстаўляе левае крыло “чырвоных”, што мае на мэце аб’яднанне антыпамешчыцкага руху з нацыянальна-вызваленчым.<br>Выходзіць першы нумар “Мужыцкай праўды”.<br>Пераходзіць на нелегальнае становішча. Выступае пад чужымі імёнамі: Вітажэнец, Хамовіч, Хамуціус, Макарэвіч, Чарноцкі, Васіль Світка. |
| 1863 г.<br>10 (22).01<br>20.01 (1.02)<br><br>27.02 (11.03)<br><br>1.05 (13.05)<br><br>31.07 (12.08) | <br>Пачатак узброенага паўстання ў Польшчы.<br>ЛПК выпусціў маніфест аб паўстанні і абвясціў сябе часовым правінцыяльным урадам Літвы і Беларусі.<br>“Белы” пераварот: ЛПК распушчаны, арганізацыю ўзначальвае “Аддзел кіраўніцтва правінцыямі Літвы” на чале з Я. Гейштарам.<br>Замест памяркоўнага У. І. Назімава генерал-губернатарам прызначаны М. М. Мураўёў-“вешальнік”.<br>Арыштаваны Я. Гейштар. Каліноўскі становіцца кіраўніком “чырвонага жонда”, фактычна ўзначальвае ўвесь паўстанцкі рух. |
| 1864 г.<br>29.01 (10.02)<br>Люты<br>10 (22). 03 | <br>Арыштаваны ў Вільні ў Святаянскіх мурах.<br><br>Піша ў Дамініканскай турме “Лісты з-пад шыбеніцы”.<br>Публічна павешаны на гандлёвым пляцы Лукішкі ў Вільні. |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

## 2 Гісторыя стварэння, матывы і паэтыка верша "Марыська чарнаброва, галубка мая..."

К. Каліноўскі, як і П. Багрым і Ф. Савіч, – аўтар адзінага верша, які, аднак, дазваляе гаварыць пра ўнёсак паэта ў беларускую літаратуру. Верш К. Каліноўскага "Марыська чарнаброва…", адрасаваны яго каханай Марыі Ямант, з'яўляецца другой часткай напісаных у турме "Лістоў з-пад шыбеніцы". "Лісты з-пад шыбеніцы" вынесла на волю Ядзвіга Макрыцкая, цётка яго нарачонай. Праз Кёнігсберг яны трапілі ў Парыж і былі надрукаваныя ў 1867 годзе. Доўгі час лічыліся падробкай, пакуль іх арыгінал не быў знойдзены У. Казберуком у 1980 годзе ў Польскай Нацыянальнай бібліятэцы ў Варшаве.

Яшчэ да нядаўняга часу даследчыкі лічылі, што змагар і барацьбіт К. Каліноўскі не меў нават надзеі на асабістае шчасце. Паказальны ў гэтым сэнсе верш У. Караткевіча "Нявесце Каліноўскага". У 80-я гады з'явілася меркаванне (у падручніку А. Лойкі таксама яшчэ прысутнічае гэтая інфармацыя), што ў сваім адзіным вершы аўтар звяртаецца не да прымроенага вобраза, а да канкрэтный дзяўчыны – Марылі Грэгатовіч – дачкі гаспадыні адной з канспіратыўных кватэр у Вільні. Зараз вядома, што верш адрасаваны М. Ямант, сям'я якой ўдзельнічала ў паўстанні. Дарэчы, будучы пад арыштам, Каліноўскі быў апазнаны менавіта М. Грэгатовіч, што з'яўляецца ўскосным пацверджаннем пра правільнасць вызначэння адрасата сучаснымі літаратуразнаўцамі.

У той жа час верш гучыць як запавет свайму народу. Двухадраснасць, кантрастнасць верша выклікала ў асяроддзі даследчыкаў памылковую думку аб двух розных вершах, напісаных Каліноўскім. Аднак цэльнасць асобы рэвалюцыянера, для якога асабістае шчасце і шчасце народа было непадзельным, тлумачыць такое дзіўнае спалучэнне ў перадсмяротным вершы-развітанні. Сінтэз інтымнага, пяшчотнага звароту да каханай і тэстаментавых радкоў грамадзянскага гучання арганічны для цэльнай асобы аўтара. Менавіта ў спалучэнні матываў суму і горычы развітання з любай і веры ў лепшую будучыню народа ёсць наватарства і арыгінальнасць верша.

Відавочныя фальклорна-песенныя матывы ("галубка мая", "ясна доля твая") узмацняюцца танічнымі народнымі інтанацыямі. Цэзура ў першых радках надае твору журботнае гучанне. У той жа час прыблізныя рыфмы (памаліся – адзавуся), архаічныя формы, чаргаванне мужчынскіх і жаночых рыфмаў сведчаць пра ўплыў сілабічнай сярэднявечнай і польскай паэзіі.

Побач з фальклорнай традыцыяй у вершы ўжываецца рэлігійна-хрысціянская сімволіка. Аднак шчыры зварот да Бога спалучаецца з багаборніцкімі матывамі, бо праўда – вышэй за неба:

Калі за нашу праўду Бог нас стаў караці
Дай у прадвечнага саду вялеў прападаці,
То мы прападзем марна, но праўды не кінем,
Хутчэй неба і шчасце, як праўду, абмінем.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Такім чынам, не вылучаючыся версіфікатарскай тэхнікай і адточанасцю формы, верш К. Каліноўскага паводле зместу – яскравы ўзор грамадзянскай лірыкі, поўны лірызму і трагедыйнага гучання.

### 3 Майстэрства К. Каліноўскага-публіцыста

Улетку 1862 года ў беларускіх вёсках і мястэчках, на кірмашовых пляцах ды прыдарожных палях людзі пачалі знаходзіць друкаваныя лацінкаю лісткі. Яны мелі невялікі памер, іх зручна было разгладзіць на калене ў хвіліну адпачынку проста на полі, а прачытаўшы – лёгка схаваць. Гэта была першая ў гісторыі беларускага народа газета, напісаная на яго мове, – "Мужыцкая праўда". Пісьменны селянін, водзячы пальцам па радках, са здзіўленнем адкрываў для сябе, што гэтая газетка сапраўды гаворыць пра мужыцкія клопаты, прычым гаворыць на простай і зразумелай мове.

"**Мужыцкая праўда**" – першая першая беларускамоўная (лацінкай) газета, адрасаваная народу, рэвалюцыйнае перыядычнае выданне з сімвалічнай назвай. Газета выдавалася К. Каліноўскім разам з паплечнікамі В. Урублеўскім, Ф. Ражанскім, С. Сангіным у выглядзе лісткоў невялікага фармату перыядычнасцю прыблізна раз на месяц: шэсць нумароў – у 1862 г., сёмы – у 1863 г., пад час паўстання. Месца выдання газеты найперш звязваюць з Гродзеншчынай, а таксама з друкарнямі Беластока, Вільні, Мінска. На карысць таго, што газета выдавалася ў розных друкарнях, гаворыць той факт, што розныя нумары былі набраны розным шрыфтам. Калі выказаць гіпотэзу пра канкрэтныя месцы на Гродзеншчыне, то гэта маглі быць Саколка, дзе на пасадзе загадчыка пісарска-егерскага вучылішча стала працаваў Урублеўскі, або Вялікая Бераставіца, дзе працавалі Ражанскі і яшчэ адзін паплечнік К. Каліноўскага – Ігнат Казлоўскі.

Ідэйна-мастацкая сутнасць "Мужыцкай праўды" была цалкам абумоўлена задачамі паўстання 1863 г. і мела выразны агітацыйна-пракламацыйны характар з мэтай узняць сялян на паўстанне. Пры тым, што ў выданні газеты заўважаецца пэўная паслядоўнасць, г. зн. кожны нумар прысвечаны канкрэтнай тэме (№ 4 – адукацыя, № 5 – рэкрутчына, № 6 – рэлігія), у ёй раскрываюцца тры скразныя пытанні:

1) **"зямлі і волі"**: выкрываецца рабаўніцкі характар рэформы 1861 г., сцвярджаецца, што зямля належыць народу, чалавек сапраўды свабодны, толькі мае надзел зямлі, волю трэба здабываць ва ўзброенай барацьбе;
2) **дзяржаўнай сістэмы**: "не народ створаны для ўрада, а ўрад для народа". Аўтар паказвае тыранічную сутнасць царскага самадзяржаўя, несправядлівасць суда, еднасць цара з чыноўнікамі непасільнасць рэкрутчыны.

Гаворачы пра рэкрутчыну, К. Каліноўскі спрабуе растлумачыць неўсвядомленасць, цемнату сялян, рукамі якіх падаўляюцца паўстанні супраць царызму: "Нашымі грудзьмі цар маскоўскі застаўляецца і нашымі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

рукамі ўсмірае бунты і запрагае ўсіх нас у вечную няволю”. Агітацыйныя ідэі тут часта пераплятаюцца з палітычна-асветніцкімі, якія падмацоўваюцца канкрэтнымі фактамі гісторыі. Аўтар растлумачвае паходжанне прыгоннага права, дае ацэнку паўстанню Т. Касцюшкі, спрабуе высветліць прычыны паражэння Расіі ў Крымскай вайне.

3) **Свабоды рэлігіі, адукацыі і мовы**: абвяшчаецца свабода веравызнання, уніяцтва разглядаецца як нацыянальная вера беларусаў, даецца негатыўная ацэнка прымусоваму навязванню праваслаўя, што справядліва бачыцца адным з апірышчаў самадзяржаўя.

Адметна, што, будучы каталіком, Каліноўскі апеляваў да ўніяцтва з мэтай прыцягнуць да паўстання як мага больш сялян, тры чвэрці з якіх былі пазбаўлены ў 1839 г. сваёй веры. У газеце сцвярджаецца, што народ павінен мець свабоду выбару мовы, навучання на роднай мове, існуючая ў царскай Расіі школьная сістэма школьнага разглядаецца як сродак русіфікацыі: “У нас, дзецюкі, адно вучаць у школах, каб ты знаў чытаці па-маскоўску, а то для таго, каб цябе зусім перарабіці на маскаля”. Вельмі важна падкрэсліць, што слова “маскаль” у газеце не атаясамліваецца са словам “рускі”, а выступае сінонімам усяго антынароднага, самадзяржаўнага. К. Каліноўскі ўсведамляе агульнасць становішча і мэтаў беларускага і рускага народаў: “Маскаль то хітры, ён-то, дзецюкі, хоча, каб не даці нічога, а народ думаў, што ўжэ мае ўсё як належыць. Не мерыўшы, судзеце хаця з гэтага а яго хітрасці. Два рокі ўжэ таму, калі яшчэ ніякіх маніхвэстаў а вольнасці не аб’яўлялі, народ у Пецярбургу, Маскве і па ўсёй Расееі пачаў вельмі крычаці, што калі ронд не дасць яму вольнасці, то ён цэлаю грамадою 19 фэвраля збунтуецца”. Выйсце з такога становішча бачыцца ў адкрытай барацьбе і пабудове грамадства, заснаванага на роўнасці і прынцыпе справядлівасці: “Каб мужыкі ўсе разам ўзбунтаваліся і хваціліся б за сякеры, нажы і косы, <…> мы на векі вечныя былі ўжо вольныя”.

Эмацыянальнае ўздзеянне “Мужыцкай праўды” павялічвалася псіхалагічна дакладнымі прыёмамі:

- бліскучым валоданнем беларускай мовай (гродзенскія гаворкі);
- непасрэднымі зваротамі да чытача (нават кожны нкмар пачынаўся трапным зваротам – Дзецюкі!);
- даступнымі алегорыямі і параўнаннямі:

“Ронд гэта заўсім так сама, як чалавек. І як чалавек мае галаву на тое, каб думаў, а рукі і ногі, каб зрабіў так, як задумаў, так ронд мае цара, каб рондзіў, а чыноўнікаў па ўсіх местах і мястэчках, каб зрабілі, як цар захоча. Для таго як галава ў чалавека калі задумае кепскае, то ногі і рукі кепскае зробяць, так у рондзе калі цар глуму захоча, то чыноўнікі глуму наробяць”.

- трапным выбарам псеўданіма – Яська-гаспадар з-пад Вільні.

Такі псеўданім абраны невыпадкова. Гаспадар – не проста селянін, а паважаны ў вёсцы чалавек, які мае сваю гаспадарку і зямельны надзел. Маглі ўзнікнуць і больш аддаленыя асацыяцыі: гаспадаром называлі вялікага князя літоўскага. “Вільня” таксама наўмысны прыём мастацкай умоўнасці – былая

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

сталіца магутнай дзяржавы, горад і ў XIX ст. прасякнуты духам вальданумства і дэмакратыі.

К. Каліноўскі развіў у газеце жанры прамоўніцкай прозы, народнай гутаркі, палітычнага памфлета; увёў у беларускае мастацтва слова лозунг як літаратурную форму. Жывасць, гнуткасць мовы забяспечваецца і разнастайнымі мастацкімі сродкамі: іронія, сарказм, рытарычнае пытанне, лексіка-інтанацыйны паўтор, параўнанне, паралелізм, фальклорная сімволіка (вобраз сяўбы і жніва як сімвалы паўстання), грубаваты народны жарт.

Аднак у выкладзе пэўных ідэй заўважныя і недахопы: спрошчанае вытлумачэнне паходжання прыгоннага права (не ўлічваюцца эканамічныя фактары), ідэалізацыя мінулага, перабольшванне значэння асветы і рэлігійнага пытання.

"Мужыцкая праўда" выклікала цікавасць і сярод перадавых колаў эміграцыі: пра рэпрэсіі за яе распаўсюджанне пісаў герцэнаўскі "Колокол", які называў яе "летучими листками", шосты нумар быў цалкам перадрукаваны польскім часопісам "Глос Вольны".

Акрамя "Мужыцкай праўды", публіцыстычную спадчыну К. Каліноўскага складаюць польскамоўныя матэрыялы ў газеце "Хоронгев свободы", што выдавалася ў Вільні ЛПК. Магчыма, яму належыць аўтарства надрукаванага ў Парыжы "Пісьма ад Яські-гаспадара з-пад Вільні да мужыкоў зямлі польскай". Апошні яго твор – перадсмяротныя "Лісты з-пад шыбеніцы", запавет Яські-гаспадара свайму народу, поўны веры ў яго сілы і будучую свабоду. У гэтым сэнсе цікава, што Яська, будучы літаратурным героем, цалкам падзяліў лёс Каліноўскага – загінуў на шыбеніцы. Гэта сведчыць пра тое, што аўтар максімальна атаясамліваў уласную асобу з асобай Яські.

## 6 Дзесяць цікавых фактаў пра Кастуся Каліноўскага

*Факт 1*. Нарадзіўся ў шматдзетнай сям'і. У Сымона Каліноўскага ад двух шлюбаў было 25 дзяцей. Нашчадкаў далі толькі чатыры.

*Факт 2*. Як і В. Дунін-Марцінкевіч, быў ахрышчаны двойчы. Першы раз у адпаведнасці са святцамі ў гонар каталіцкага святога Вінцэнта Сарагоскага. А другі – у гонар Канстанціна, сына святара Мастаўлянскай уніяцкай царквы Сымона Крукоўскага, з якім сябравала сям'я Каліноўскіх.

*Факт 3*. Навучаўся ў Пецярбургскім універсітэце бясплатна, прадставіўшы пасведчанне аб цяжкім матэрыяльным становішчы.

*Факт 4*. Лідарскія здольнасці Кастуся праявіліся ўжо ў час студэнцтва: яго абралі на пасаду бібліятэкара (галоўная пасада) пры зямляцтве студэнтаў з былой Рэчы Паспалітай "Огул".

*Факт 5*. У 1859 годзе захварэў на цяжкую нервовую хваробу, "падобную да падучкі" – эпілепсію, пераадолець якую яму дапамог вядомы пецярбургскі медык Мікалай Фёдаравіч Здэкаўэр.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*Факт 6*. Меў вельмі катэгарычны характар, не цярпеў пярэчанняў, з іншага боку – валодаў вялікай харызмай, меў амаль гіпнатычнае ўздзеянне на паўстанцаў.

*Факт 7*. Лічыў што шляхта як клас павінна быць знішчаная: “*...перадусім нам трэба знішчаць гэтую гнілую і гангрэнозную касту, якую называюць дваранствам”.*

*Факт 8*. Рызыкуючы ўласным жыццём, прысутнічаў амаль на кожным публічным павешанні паўстанцаў.

*Факт 9*. Вырак Кастусю Каліноўскаму прадугледжваў расстрэл, але генерал-губернатар Міхаіл Мураўёў асабіста замяніў пакаранне на павешанне, якое і адбылося 22 сакавіка 1864 года. Падчас чытання прысуду Каліноўскі ў адказ на тое, што яго назвалі дваранінам, прамовіў: “У нас няма дваран, усе роўныя”.

*Факт 10*. У 2016 годзе ў выніку апоўзняў на Замкавай гары былі знойдзены магілы. У сакавіку 2019 года была здзейснена экспертыза ідэнтыфікацыі парэшткаў, у выніку якой выяўлена, што яны належаць паўстанцам 1863 года, у тым ліку К. Каліноўскаму. 22 лістапада 2019 года ў Вільні адбылася ўрачыстая цырымонія перапахаваньня парэшткаў Кастуся Каліноўскага на могілках Росы.

## 7 Асноўныя тэрміны

Адрасат, алегорыя, верш, газета, грамадзянская лірыка, жанр, запавет, ідэалізацыя, іронія, лексіка-інтанацыйны паўтор, ліст, лозунг, палітычны памфлет, паралелізм, параўнанне, пракламацыя, прамоўніцкая проза, псеўданім, рытарычнае пытанне, сарказм, сімволіка, улётка, фальклорна-песенныя матывы, цэзура.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ